

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская




№33 (166). 10 — 16 жніўня 2000г. Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 85 руб.

"МІТЫНГ" КАЛЯ ВІНЗАВОДА

7 жніўня каля Слонімскага вінзавода сабраліся больш за 200 чалавек. Яны патрабавалі выплаціць грошы за раней здадзеныя прадпрыемству яблыкі.



Людзям іх не выдавалі яшчэ з 27 ліпеня. "Мітынгуючыя" скардзіліся: "Мала таго, што нам трэба 10-12 гадзін стаяць, каб здаць яблыкі, дык яшчэ потым цэлыя суткі трэба дзяжурыць каля прахадной, каб атрымаць за іх грошы". Людзі нават ноччу займалі месца ў чарзе.



ОБЪЯВЛЕНИЕ

С 27.07.2000 г. в связи с нехваткой наличных денег прием яблок производится на запись. Выдача наличных денег за сданные яблоки будет производиться с 01.08.2000 г.

"Вось адна цяжарная жанчына прыехала з вёскі, у яе дома пяцёра галодных дзяцей, а ёй грошай не далі". "Я — інвалід, цэлыя суткі ў чарзе стаю, а мне яшчэ ні капейкі не далі", "У нас што — нервы жалезныя?!", — гаварылі абураныя людзі.

Пракаменціраваць узгаданую сітуацыю карэспандэнт "ГС" папрасіла дырэктара вінзавода Міхаіла Акуліка. Вось што ён сказаў: "Мы прымаем яблыкі, а грошы пакуль некалькі дзён не выплочвалі, бо ў нас не была адкрыта крэдытная лінія, былі праблемы з наяўнымі. Мы пра гэта людзей папярэджвалі, гаварылі ім, каб яны ўдакладнялі, калі будуць грошы. Сёння мы пагасім усе свае запазычанасці. Для гэтага пасадзім некалькі касіраў, каб усе людзі паспелі атрымаць грошы сёння".

І сапраўды, абяцаныя грошы пачалі выдаваць у гэты ж дзень, дзесьці ў 16.30. Трэба толькі спадзявацца, што надалей нарыхтоўка яблык ад насельніцтва будзе ісці без праблем, а грошы – выплочвацца своечасова.

Вольга ШЫНКЕВІЧ



Фота Віталя ГІЛЯ

навіны

Вадзіцелі застаюцца без зарплаты

Канфліктная сітуацыя склалася ў Слонімскім грузавым аўтапарку №11, дзе працуюць 208 чалавек.

Для вадзіцеляў няма работы, а значыць няма і заробатнай платы. Калектыў гэтым незадаволены.

У аўторак, 8 жніўня, карэспандэнт "ГС" папрасіў намесніка дырэктара гэтага прадпрыемства Уладзіміра Сасновіча (дырэктар у гэты час быў у камандзіроўцы ў Гродне) пракаменціраваць сённяшнюю сітуацыю. Ён, у прыватнасці, сказаў, што ў панядзелак, 7 жніўня, у аўтапарку адбыўся сход. На ім прысутнічаў і старшыня гарвыканкама Алег Лакцюшын. На сходзе ішла размова аб сённяшнім стане аўтапарка №11. "У нас, сапраўды, паменшыўся аб'ём работ па перавозцы, — сказаў Уладзімір Яфімавіч. — Мы маем шмат самазвалаў, але яны поўнасцю неэксплуатуюцца. У мінулыя гады ў гэты час заўсёды працы хапала. Кіраўніцтва аўтапарка, вядома, шукае заказчыка. Адначасова імкнуцца размяркаваць вадзіцеляў на іншыя машыны, каб даць людзям зарабіць. Ідуць перамовы аб паездцы нашых вадзіцеляў на працу ў Расію і г.д. Пытанне аб фінансаванні дарожнай галіны ў бліжэйшыя дні будзе разглядацца і ў Савеце Міністраў, можа атрымаем дадатковае фінансаванне з Мінска", — адзначыў Уладзімір Сасновіч.

Сяргей ЧЫГРЫН

Филармония — монополист

Гродненская областная филармония стала монополистом.

Согласно решению облисполкома об упорядочении концертной деятельности, на филармонию возложена организация всей концертной деятельности на территории области.

Этим же решением дворцы и дома культуры, клубы и другие учреждения культуры лишаются права самостоятельно приглашать на гастроли художественные коллективы и исполнителей. Для получения разрешения на проведение концертов администрация названных структур должна представить в филармонию лицензию, репертуар и соответствующую рекламную продукцию.

Демократы готовят референдум

Координационная рада демократических сил Беларуси намерена собрать необходимое количество подписей граждан (450 тысяч) для проведения всенародного референдума в поддержку четырех условий проведения парламентских выборов в Беларуси, выдвинутых мировым сообществом.

Такое решение принято на прошедшем 7 августа заседании Координационной рады. На заседании также решено провести ряд согласованных акций демократических сил. В частности, предполагается организовать наблюдение и обобщить нарушения, которые будут допущены в ходе парламентских выборов в Минске, областных центрах, наиболее крупных городах Беларуси и, выборочно, в сельских районах.

БелаПАН

У каталікоў — свята

У мінулую нядзелю, 6 жніўня, каталікі адзначалі свята Перамянення Гасподняга (Спас).

З гэтай нагоды ў каталіцкіх храмах Слонімшчыны прайшлі святочныя набажэнствы і хрэсныя хады. Шматлюдна было ў гэты дзень і ў Зэльвенскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы (на здымку). На свята, па традыцыі, у касцёл вернікі прынеслі яблыкі, якія асвячаў святар.

Сяргей ЧЫГРЫН, Віталь ГІЛЬ (фота)



здарэнні

Арудуюць злодзеі

Каля Дзераўной у лесе адзін са слонімцаў пакінуў без нагляду матацыкл. Яго ўкралі падлеткі, якіх хутка затрымала міліцыя. Матацыкл вярнулі ўладальніку.

На вуліцы Баграціёна ў Слоніме злодзеі залезлі ў адзін з агародаў і выкапалі з градкі цыбулю. Частку гароднiны, пасля таго, як міліцыя затрымала злодзеяў, зноў вярнулі гаспадыні. Астатнюю цыбулю злачынцы паспелі абмяняць на гарэлку.

У калгасе "Чырвоная зорка" невядомыя са склада ўкралі хімікаты. Вядзецца следства.

Сяргей ЧЫГРЫН

Убийство ребенка в Волковыске

Страшная трагедия разыгралась в Волковыске.

Житель Гродно, который находился в гостях у своей двоюродной сестры, убил ее восьмимесячную дочь. Будучи в состоянии реактивного психоза, он нанес спящей девочке два удара ножом в брюшную полость...

Совершив преступление, убийца причинил себе резаную рану брюшной полости и был помещен в больницу, где находится до сих пор под охраной милиции.

Ася КУНИЦКАЯ



ЦЫГАНЕ "СВОИ" И НАСТОЯЩИЕ

Цыгане — этнические группы, связанные общностью происхождения и языка; живут во многих странах. Предки — выходцы из Индии (конец 1-го тыс. н.э.) Общая численность по разным оценкам от 1,4 до 6 млн. человек и более. Язык цыганский; большая часть цыган говорит и на языках окружающих народов. На недавнем 5-м конгрессе Всемирного цыганского союза в Праге был создан первый в истории цыганский парламент, принята первая цыганская конституция, избран первый цыганский президент (им стал доктор Эмиль Щука). У цыган есть свой флаг: полотнище с синим и зеленым полями, символизирующими землю и небо. Посередине — колесо, знак кочевой жизни народа. Есть и свой гимн.



Сегодня в Беларуси проживают более 60 тыс. цыган. 60-70% из них живут в городах, остальные – в сельской местности. Сегодня прожиточный минимум в их среде составляет 7 долларов, только 20% детей посещают школы и дошкольные учреждения, около 45% всего цыганского населения проживают в зараженной зоне.

В детстве я с восторгом смотрела фильмы о красивых, артистичных, вольных цыганах. Я мечтала хоть несколько дней пожить среди них, ощутить ту, как мне казалось, необыкновенную атмосферу, которой наполнена их жизнь. Я представляла себя кочующей вместе с цыганами по миру, распевающей песни у костра... Особенно мне нравились слова из одного романса: "И цыганская дочь за любимым в ночь по родству цыганской души...".



Я не понимала, почему взрослые негативно относятся к этим замечательным людям, почему, увидев толпу цыган на улице, стараются перейти дорогу или почему учат детей, чтобы они никогда не открывали дверь цыганам. "Это очень хитрые люди, они обманывают и крадут", – предупреждала меня бабушка. Я не могла поверить, что герои моих мечтаний, – обыкновенные воры и лентяи.

Мое романтическое настроение развеялось, когда я сама столкнулась с этими людьми. Дело в том, что семью цыган на некоторое время поселили с нами по соседству. У них было очень много детей. Они удивляли всех соседей своей неряшливостью, постоянными криками и ссорами. Маленькие цыгане могли бегать раздетыми зимой, старались хоть что-то украсть у соседей...

Тогда я разочаровалась в этих людях, однако надежда на то, что не все такие, осталась до сих пор.

"Не верьте ничему, что говорят цыгане, они в душе смеются над вами, – начал свой рассказ человек, проживший долгое время среди цыган, – их язык предназначен для того, чтобы обмануть, скрыть. На первом месте у цыган – выгода. Я боюсь, что растеряно все, что веками у них было хорошего.

У этих людей свои законы и свой суд. Если цыгане поссорились, то они собирают суд. На нем выслушивается суть дела, принимается решение. Если один из цыган не согласен с "постановлением" первого суда, он собирает другой состав, из более уважаемых цыган. Только слово цыгана имеет вес и значение, больше ничьим словам они не верят.

У этих людей свои условности, свои правила. Например, если мужчина ввязался в женский спор или постирал женское белье, его могут замагировать, то есть провозгласить "нечистым". Это своего рода проклятие, которое очень трудно снять. Если замагированный придет в гости к другому цыгану попить чая, то потом кружку, из которой он пил, обязательно выкинут, никто больше к ней не притронется. Замагированность можно, конечно, снять, но для этого опять придется созывать цыганский суд...

Цыгане зарабатывают деньги торговлей, гаданием, причем есть очень серьезные гадалки, – продолжал мужчина, который не понаслышке знает про жизнь цыган".

"А коней они крадут?" – спросила я, вспомнив фильмы.

"Раньше крали, а теперь уже нет. У них и других дел хватает. Считанные люди работают в государственных учреждениях, для них где-то работать считается непочетным занятием. У цыган в семье мужчина – хозяин, а женщина – добытчица денег, она должна приносить деньги в дом. Причем, мужа не волнует, где жена берет деньги, они всегда должны быть.

У цыган странные семейные отношения: мужчина может привести в дом женщину, сказать своей прежней жене: "Теперь она моя жена". Бывшая супруга уходит из дома. Потом, прожив со второй женой несколько месяцев, он может привести третью женщину и сказать: "Это моя жена"... И так сколько угодно раз.

Раньше у цыган не было документов, а теперь жизнь заставляет их иметь. Многие люди думают, что цыгане – все на одно лицо, даже милиция иногда не может их различить. Поэтому, если цыган назвался Петей или Васей, никто не сможет проверить, точно ли это? У них фамилия одна, записан на другую, рожден под третьей... Тяжело сказать, сколько цыган проживает сейчас в Слониме. По некоторым данным, их где-то около 40-50, я не считаю многочисленных детей, воспитанием которых никто не занимается.

Теперь четкой иерархии у цыган нет. Есть человек более голосистый, богатый, чем остальные. И все. Он и считается бароном. Но цыгане по-настоящему уважают только самих себя..."

Слушая этот рассказ, я с ностальгией вспоминала "своих" цыган, созданных в моем воображении еще в детстве. Как же они отличаются от настоящих! Однако меня до сих пор удивляет и поражает их необыкновенная любовь к свободе, артистизм, жизненная энергия, которую они унаследовали от своих далеких предков и не утратили на протяжении тысячелетий.

Александра ГРЕЦКАЯ

ЭКАНАМІЧНЫ АГЛЯД

Заклікі Лукашэнкі праблему НЕ ВЫРАШАЮЦЬ

На нядаўняй селектарнай нарадзе Аляксандр Лукашэнка паставіў перад хлебаробамі задачу – сабраць сёлета 6 млн. тон збожжа. Але ці будзе выканана гэтае заданне, і ці сапраўды Беларусь атрымае рэкордны ўраджай?

На сёння ёсць дзве агульныя перадумовы, якія вызначаюць ход любых сельскагаспадарчых работ, тым больш жніва. Гэта крызіс рэальнага сектару эканомікі ў цэлым і поўны заняпад сельскай гаспадаркі. Заняпад вёскі можна выразна паказаць на прыкладзе Гродзенскай вобласці – перадавой у краіне ў аграрным сектары. Тут на пачатак жніва было назапашана толькі 11% дызельнага паліва і 9% бензіну ад патрэбнага. У калгасаў няма грошай, затое ёсць даўгі. Толькі "Белнафтахіму" гаспадаркі вобласці завінаваціліся 815 млн. рублёў. Такія грошы няма адкуль узяць. План продажу малака за першае паўгоддзе недавыкананы на 6%. Яшчэ горшае становішча з вытворчасцю мяса. Тут скарачэнне складае ажно 16%. Парадокс, але за паўгоддзе ў вобласці з'елі мяса на 12% болей, чым вырасцілі. Што ўжо казаць пра эканамічнае забеспячэнне жніва ў іншых абласцях, напрыклад, у Віцебскай і Магілёўскай, якія заўсёды былі адсталымі...

Днямі кіраўнік эканамічнай управы Міністэрства сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра назваў дзве цікавыя лічбы. Менавіта: ад падвышэння закупачных цэнаў на малако, збожжа ды іншыя прадукты гаспадаркі атрымаюць 150 млрд. рублёў, а ад падвышэння цэнаў на рэсурсы страцяць 360 млрд.

З прычыны недахопу грошай, на палях краіны працуе толькі 14 тысяч камбайнаў або 76,5% ад іх агульнай наяўнасці. На рамонт, а тым болей набыццё новых камбайнаў, няма грошай. На 3 жніўня ўбрана 16% плошчаў збожжавых. Намалочана 1200 тысяч тон збожжа, па 25 цэнтнераў з гектара. Прычым, гэта бункерная вага, такім чынам, у свірны паступіць менш як 1 млн. тон. Зразумела, што кожная наступная частка ўбранага поля, як і ў папярэднія гады, будзе даваць усё меншы збор. Так што дай Бог, каб рэальна было сабрана 4 млн. тон. збожжа.

Ураджайнасць знізіцца з-за ўсходніх рэгіёнаў краіны. Галоўныя прычыны павольнага ходу жніва – зношаная тэхніка і перабоі з палівам. На сёння на 40% не вырашаны праблемы аплаты рэсурсаў, найперш за паліва. І так ва ўсіх рэгіёнах.

Не вырашаны праблемы стымулявання працы на жніве. Бо запазычанасць у аплаце працы не скарачаецца, а расце, і на пачатак жніўня перавысіла 19 млрд. рублёў. Заклікі Лукашэнкі разлічваюцца з вяскоўцамі за іхнюю працу збожжам і кармамі праблему не вырашаюць...

Уладзімір КУЛАЖАНКА



Фота IREX/ProMedia

Преступность в Беларуси

Уровень и динамика преступности в Беларуси в первом полугодии 2000 года не претерпела значительных изменений в сравнении с аналогичным периодом прошлого года.

Однако несколько увеличилось количество тяжких преступлений – их совершено 35 177 против 33 563 за аналогичный период 1999 года. Хотя на 1 процент сократилось количество умышленных убийств – в первом полугодии их совершено 590 против 596 за аналогичный период минувшего года, на 16,2 процента увеличилось количество разбоев и на 5,1 процента – число грабежей.

Увеличилось и количество погибших. В первом полугодии по разным причинам погибли 6 251 человек – (увеличение на 1,1 процента), в том числе от совершения преступлений – 1 811 человек, что на 29 процентов больше, чем в первом полугодии 1999 года. Отмечено и резкое сокращение применения смертной казни в Беларуси. За 6 месяцев этого года только один человек осужден к смертной казни, в то время как в первом полугодии 1999 года такие приговоры были вынесены в отношении 10 человек. В то же время 8 человек в этом году осуждены к пожизненному заключению, и сейчас пожизненное лишение свободы отбывают 46 человек.

В Гродненской области за первое полугодие совершено 5415 преступлений, из которых 3411 – по линии уголовного розыска. Совершено 43 убийства (раскрываемость составила 93%), 81 угон автотранспорта, возбуждено 16 уголовных дел, связанных с сутенерством. Раскрыто около трехсот преступлений прошлых лет. Объектами нападения чаще всего становятся квартиры.

На Гродненщине проводится операция «Аграрник», которая ставит своей целью недопущение хищений колхозной и государственной собственности, предупреждение гибели людей, транспортных преступлений, пожаров.

Геннадий БАРБАРИЧ

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік Віктар ВАЛАДАШЧУК
В.а. рэдактара Сяргей ЕРШ

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі 2-14-39
.........(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць. Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Падпісана да друку 9 жніўня 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Слонімскай узбуйненай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы: 64042 (індывідуальная) 63818 (ведамасная)
Наклад 9000 экз.
Заказ № 2609

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

"ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ ДА МЯНЕ Ў ГОСЦІ..."

Яна ляжала ў самым кутку палаты. На белай падушцы — пасмачкі адбеленых сівізной валасоў. Стомлены, змучаны хваробамі твар. Паверх пакрывала — спрацаваныя, у вузельчыках мазалёў рукі. Іншы раз яна разглядвала іх і дзівілася, што такія белыя, што нават трэшчынкі ад вечнай сялянскай працы зацягнуліся і сталі непрыкметнымі.

— Вядома ж, які ўжо час нічога не раблю, то і рукі як у пані сталі, — разважала ўголас бабка Серафіма. — Лічы, месяц, як тут. А дома ж столькі клопатаў! І сенаванне, і авечкі, і каровы трэба пасвіць, свіння вось-вось павінна апарасіцца... Як там братавая з усім спраўляецца? Цяпер яна зусім адна, а так мы ўдзвюх жывём. Яшчэ і да мяне прыязджала. Пазвані, міленькая, каб больш не ехала. Я тут паляжу, дык можа як і выкараскаюся. Адно каб дактары хваробу распазналі. А як вярнуся ў сваю вёску, то вы ўсе прыязджайце да мяне ў госці. У нас мясціны цудоўныя. Лес кругом, а ў ім ягад і грыбоў — процьма. Вось пабачыце. Вам спадабаецца. Усім, хто бывае ў нашых краях, падабаецца...

Я сяджу на краёчку яе ложка і з жалем пазіраю на засмяглыя вусны, на загарэлы твар, якому хвароба прыдала цёмна-жоўты адценак. Вочы паволі закрываюцца, і яна нібы дрэмле. Але праз нейкі час гаворыць зноў.

— Семдзесят чатыры гады пражыла і не ведала, што такое бальніца. А гэта, міленькая, на балоце мяне схапіла. Сенавала я там, і раптам галава моцна закружылася, кепска стала настолькі, што страціла прытомнасць. А цяпер вось есці нічога не магу. Як толькі паварушуся, адразу робіцца кепска. І што гэта са мной такое?

Ёй, змалку прывыкшай да сялянскай работы, якая не ведала палёгкі ні ў якую пару года, было дзіўна і незразумела, што ногі не маюць сілы, каб хадзіць, а рукі не могуць трымаць граблі ці касу. А дома ж летам столькі работы!

— Вось жа пражыла гэта Серафінька, як на свінні праехала, — накіроўваючыся разам са мной на працэдуры, сказала другая суседка па палаце. — Адна-адзінюткая на свеце, а да самага апошняга працавала, як чорны вол. У яе ж ні мужа, ні дзяцей, ні ўнукаў няма. Усё для пляменнікаў стараецца, якіх мае — не злічыць. Іхнім жыццём на свеце трымаецца. Вось жа, скажы, доля ў чалавека. Дурная баба, адным словам, і няма чаго тут гаварыць, — падвяла рысу суседка.

Толькі праз некалькі дзён я зразумела, чаму ў яе словах было столькі нейкай нядобрай зайздрасці да адзінокай бабкі Серафімы. Да самой яе, хоць ляжала тут ужо больш тыдня, не наведаўся ні адзін з трох сыноў. А да Серафімы хадзілі і ездзілі часта.

— Вось гэты, што быў у ваеннай форме, — падпалкоўнік. Ён у Гродне жыве, — тлумачыла яна пасля аднаго такога візіту. — Ён мне пляменнік. А кабета маладая, што з ім, — пляменніца. Яна таксама ў Гродне. Настаўніцай працуе. Бачыце, колькі мне ўсяго навезлі. Нейкіх сокаў заморскіх, апельсінаў, бананаў. А я ж, міленькая, нічога есці не магу. Частуйцеся вы ўсе, бярыце, — запрашала яна жанчын з палаты.

Мы дзякавалі, але нічога не бралі. Не да яды тут...

Пасля кожнага такога наведвання вочы бабкі Серафімы свяціліся шчасцем. І не ад тых заморскіх сокаў ды рознай садавіны, а ад увагі, клопату розных людзей. Яна станавілася больш гаваркой, вясёлай.

— Вы ж былі на працэдурах, а да мяне яшчэ адна пляменніца з дачкой прыязджалі. Сама — галоўны заатэхнік у калгасе, а дачка — настаўніца. Муж у дачкі — выкладчык медыцыны. А яшчэ ў мяне ёсць пляменнікі ў Ленінградзе. Таксама прыехалі б, каб ведалі, што захварэла. Але навошта ім ведаць? Вылечуся, тады напішу пісьмо, — расказвала яна аднойчы. — А яшчэ сёння мяне глядзелі многа ўрачоў. Казалі, у Гродна трэба ехаць, у бальніцу. Там мяне праверяць, бо тут патрэбнай апаратуры няма. Што ж, паеду, можа там які паратунак знайду.

Страшнымі былі ночы. Тады да яе падступаўся дзікі боль. Каб не будзіць жанчын, што забываліся пра свае балячкі ў неспакойным сне, яна варочалася на ложку, кусала губы, церла рукі. А калі станавілася зусім нясцерпна, з грудзей вырываўся стогн, а потым — крык. Прыходзіла медсястра з двума ўколамі, і праз нейкі час Серафіма засынала. Раніцой, калі прачыналася, болю ўжо не было. І так кожныя суткі.

Яна ад'язджала ў Гродна на другі дзень пасля таго, як мяне выпісалі. Жанчыны з палаты казалі, што збіралася туды з вялікай ахвотай, шчыра спадзеючыся знайсці паратунак ад гэтага нечалавечага болю і ад слабасці, якая скоўвала ўсё цела.

Там, у бальнічнай палаце, ёй будзе сніцца духмяны луг са стракатым дыванoм кветак і яна сама — дужая, поўная сіл, з граблямі ці касой у руках. А вакол яе, як маладыя бярозкі вакол старога дрэва, шматлікія пляменнікі і іх дзеці, унукі...

Вярніся, цётка Серафіма, у сваю лясную вёсачку, бо яна апусцее без тваёй шчырай усмешкі, працавітых рук і добрага, спагадлівага сэрца. Вярніся...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Кіраўніцтва БНФ "Адраджэньне" наведае Слонім

У суботу, 12 жніўня, у Слоніме ў малой зале РДК пройдзе сустрэча з кіраўніцтвам БНФ "Адраджэньне". Пачатак у 10.00.


Вінцук Вячорка
Фота IREX/ProMedia

У наш горад завітаюць Вінцук Вячорка, Вячаслаў Сіўчык і іншыя вядомыя дзеячы. На працягу дзвюх гадзін яны будуць адказваць на пытанні слонімцаў пра сённяшняе палітычнае жыццё краіны. Трэба адзначыць, што старшыня Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" і Партыі БНФ Вінцук Вячорка наведае Слонім упершыню.

Вінцук Вячорка нарадзіўся ў 1961 годзе ў Брэсце, закончыў філфак БДУ і аспірантуру Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук. Лінгвіст, спецыяліст у гісторыі мовы і арфаграфіі. Працаваў у Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце, цяпер — намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Спадчына". Сузаснавальнік Беларускага гуманітарнага ліцэя. Аўтар каля 80 публікацый па мовазнаўстве, гісторыі і паліталогіі. У 1979 г. быў адным з заснавальнікаў "Беларускай майстроўні" — першай нефармальнай маладзёжнай арганізацыі, якая была прыкрыццём падпольнай нацыянальна-вызваленчай групы. У 1988 годзе Вінцук Вячорка быў сярод заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту. Аўтар ці рэдактар большасці фронтаўскіх дакументаў. З 1994 г. — намеснік старшыні БНФ "Адраджэньне" і Партыі БНФ. На 6-ым з'ездзе БНФ "Адраджэньне" і на 4-ым з'ездзе Партыі БНФ 30-31 кастрычніка 1999 года быў абраны старшынёй. Вячорка таксама з'яўляецца старшынёй рады грамадскай арганізацыі "Цэнтр Супольнасць", сябрам Рады ТБМ імя Ф. Скарыны. Жонка Ірына па адукацыі матэматык. У сям'і Вячоркаў трое дзяцей.

Іван БЯДКО

Новая крама

У Мастах адкрылася новая рыбная крама "Альбатрос".

Тут можна набыць свежамарожаную рыбу і кансервы. Гэта ўжо пятая крама, якая сёлета адкрылася ў Мастах. Трэба заззначыць, што адкрываюць крамы іншагародняя прадпрымальнікі і арганізацыі.

Эксперымент на свінакомплексах

На свінакомплексах калгасаў імя Карбышава і "Дубна" прайшла апрабацыя распрацоўкі гродзенскіх навукоўцаў.

Лямпы для абагрэву парасят былі заменены адмысловымі полікамі з унутраным падагрэвам. Эксперымент даў добрыя вынікі.

Антон МАКЕЙ

Бел-чырвона-белыя сцягі ў Лунна

Нядаўна на дратах высакавольтнай лініі электраперадач каля мястэчка Лунна невядомыя вывесілі два бел-чырвона-белыя сцягі.

Улады арганізавалі іх зняцце толькі ўвечары.

Дарэчы, у Лунна беларускія нацыянальныя сцягі вывешваюць не першы раз. З тымі ж людзьмі, якія здымаюць іх, адбываюцца трагічныя здарэнні. Адзін з іх павесіўся, а другі патрапіў пад машыну і на ўсё жыццё застаўся калекам.

Ураджаі вялікія, лапшы хопіць на ўсіх

Згодна з дадзенымі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мастоўскага райвыканкама, ураджайнасць збожжавых у раёне нядрэнная.

І гэта не гледзячы на сухую вясну і небывалыя замаразкі. Напрыклад, азімае жыта ў калгасе "Шчара" дае болей 50 цэнтнераў з гектара, ячмень у калгасе "Дубна" — 50 цэнтнераў з гектара. Праўда, ёсць гаспадаркі, як саўгас "Мастоўскі", дзе яравой пшаніцы намалочваюць толькі 8,7 цэнтнера з гектара...

Вось як патлумачыў гэтую сітуацыю адзін са спецыялістаў райаграпрамхарчу, які прасіў не называць яго прозвішча: "Ёсць гаспадаркі і ёсць палі, дзе ўраджаі добрыя, але не ўсюды. Магчыма, некаторыя, больш вопытныя старшыні калгасаў, пасля веснавых замаразкаў спісалі лішнія плошчы і таму зараз маюць з-за гэтага вялікія намалоты".

Сіўчык быў у Мастах

На мінулым тыдні адзін з кіраўнікоў БНФ "Адраджэньне" Вячаслаў Сіўчык, разам са старшынёй абласной арганізацыі Міколам Баўсюком, наведалі шэраг гарадоў Гродзеншчыны.

Яны пабывалі ў Зэльве, завіталі ў Гудзевічы да патрыярха беларускага адраджэння Алеся Белакоза і яго паплечнікаў, наведалі Масты.

Крэдытаў няма, давай уласныя

У бягучым годзе, акрамя здачы ў эксплуатацыю катэджаў старшыні райвыканкама Аляксандра Кісялёва, першага намесніка старшыні райвыканкама Сяргея Штарнова, начальніка міліцыі Івана Здановіча і генеральнага дырэктара ААТ "Мастоўдрэў" Віктара Бурага, завяршэнне будаўніцтва іншага жылля ў Мастах не прадбачыцца.

72-кватэрны жылы дом жыллёвага кааператыва не будзе дабудаваны з-за адсутнасці крэдытных сродкаў. Намеснік старшыні райвыканкама Алена Кір'янава, якая непасрэдна займаецца пытаннямі будаўніцтва жылля, абвінавачвае членаў кааператыва ў нежаданні ўносіць уласныя сродкі на пабудову дома.

Дарэчы, на 1 ліпеня 2000 года ў чарзе на атрыманне жылля ва ўпраўленні па кіраўніцтву горадам Масты значылася 764 чалавекі пры насельніцтве ў дваццаць тысяч.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПОЧТА

Почему пустует кинотеатр

Из рекламы узнала, что в слонимском кинотеатре — комедия Эльдара Рязанова "Старые клячи" с моими любимыми талантливыми актерами Людмилой Гурченко, Лией Ахиджаковой, Крючковой, Карцевым. До этого смотрела в кинотеатре "Титаник" и "Сибирский цирюльник". Больше смотреть было нечего...

В фойе стоял неприятный запах, а зал был пустой — там сидело человек десять... Когда фильм уже шел, в зал с шумом и гамом ворвались подростки и, усевшись на последнем ряду, мешали смотреть. Приходилось их утихомиривать, так что некоторых эпизодов и реплик актеров я не увидела и не услышала. А тут еще посыпались под ноги бутылки...

Вообще, отдыха не получилось. Неудивительно, что взрослые люди перестали ходить в кино.

Не пора ли отделу культуры возобновить проведение бесед перед сеансом о культуре поведения, а администрации — следить за тишиной в зале? Хочется иногда, когда идут хорошие фильмы, посмотреть любимых актеров, только не в такой обстановке.

Елена ВЛАСОВА

НАВІНЫ

Пад цёплым крылом "Ластаўкі"

У пасёлку Гезгалы Дзятлаўскага раёна на беразе маляўнічага возера стаіць дзіцячы санаторый "Ластаўка", дзе лечаць органы дыхання і сардэчна-сасудзістую сістэму.

Тут папраўляюць сваё здароўе хлопчыкі і дзяўчынкі з усіх раёнаў Гродзенскай вобласці. Зараз у санаторыі знаходзіцца 80 дзяцей. Іх лечаць 2 урачы і 19 медсясцёр.

У будаўнікоў — юбілей

На гэтым тыдні споўнілася трыццаць гадоў Дзятлаўскаму акцыянернаму таварыству рамонтна-будаўнічага прадпрыемства № 10.

На сённяшні час — гэта лепшая арганізацыя раёна.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЗДАРЭННІ

Людзі паміраюць на хаду

За тыдзень у Дзятлаве нечакана памерлі тры чалавекі, якім, як кажуць, яшчэ жыць ды жыць.

Жанчына ішла з грыбоў і ўпала непадалёку ад свайго дома. Смерць наступіла імгненна. Мужчына пайшоў у магазін па пакупкі і там памёр. 30-гадовы дзятлавчанін паехаў на заробкі ў Расію, і там яго напаткала смерць.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Смяротны наезд

У вёсцы Жылічы Мастоўскага раёна 26-гадовы шафёр мясцовага калгаса "Світанне" у стане алкагольнага ап'янення наехаў на дзесяцігадовага хлапчука, які стаяў на абочыне дарогі.

Гродзенскі школьнік прыехаў на канікулы ў вёску адпачываць. Ад атрыманых траўмаў ён памёр на месцы. Кіроўца спрабаваў аказаць дзіцяці дапамогу, але, калі ўбачыў, што хлопчык памёр, уцёк з месца здарэння. У той жа дзень ён быў затрыманы.

Антон МАКЕЙ

БЕЛОРУССКИЕ ПОЛИТЗАКЛЮЧЕННЫЕ – ЛЮДИ С СИЛЬНЫМ ХАРАКТЕРОМ

Цирил Свобода — член делегации Парламентской Ассамблеи Совета Европы (ПАСЕ), которая сейчас находится с визитом в Минске, — считает, что Беларуси, для того, чтобы вступить в Совет Европы, необходимо, прежде всего, стать правовым государством.

По словам Цирила Свободы, это означает, что "каждый человек, живущий в Беларуси, должен быть уверен в том, что его интересы будут защищены в беспристрастном и независимом суде".

Такое заявление г-н Свобода сделал после посещения делегацией ПАСЕ, находящихся в местах лишения свободы, депутатов Верховного Совета Беларуси 13-го созыва Владимира Кудинова и Андрея Климова. По словам чешского парламентария, он был очень обрадован, когда увидел, что оба депутата пребывают в хорошем настроении. "Я объясняю это тем, что, во-первых, это люди с сильным характером, а во-вторых, они чувствуют постоянную поддержку своих семей, товарищей, белорусских и международных организаций", — сказал Цирил Свобода.

Он также сообщил, что во время бесед с министром юстиции Беларуси Геннадием Воронцовым и премьер-министром Владимиром Ермошиным международные парламентарии высказали просьбу освободить заключенных депутатов. Цирил Свобода убежден, что они находятся в заключении "по политическим мотивам".

Владимир ГЛОД



Фота IREX/ProMedia

На снимке: Тэрри Дэвис, глава тройки ПАСЕ выходит из дверей тюрьмы после встречи с Владимиром Кудиновым

ТРИ ГОДА ЗА РЕШЕТКОЙ

4 августа исполнилось 3 года со времени вынесения приговора депутату Верховного Совета Беларуси 13-го созыва Владимиру Кудинову.

Он был осужден судом Борисовского района Минской области к 7 годам лишения свободы с конфискацией имущества за дачу взятки в размере 500 долларов США сотруднику ГАИ Борисовского района.

Виновным себя Кудинов не признал, заявив, что подвергся политической расправе за участие в попытке объявления импичмента президенту Лукашенко осенью 1996 года. Его задержание, проведенное 4 февраля 1997 года, также было незаконным, так как он был защищен статусом депутатской неприкосновенности.

Суд прошел с многочисленными нарушениями. А одно из основных доказательств — аудиозапись разговора Кудинова с сотрудниками ГАИ, по заключению технической экспертизы, имела признаки монтажа.

Однако суды высшей инстанции, куда были направлены кассационные жалобы, оставили приговор в силе. Когда дело Кудинова получило международную огласку, его материалы были затребованы в Прокуратуру Республики Беларусь, после чего, по словам супруги депутата Зои Кудиновой и адвокатов, из дела исчезли некоторые важные документы, свидетельствующие о фальсификации.

Владимир Кудинов отбывает наказание в колонии УЖ 15/1, расположенной в Минске. Он несколько раз подвергался взысканиям, дважды был помещен в штрафной изолятор, что уменьшает возможность попасть под амнистию. Ранее, в результате амнистии, срок заключения был сокращен на 1 год. Ему неоднократно предлагалось написать прошение о помиловании и покаянное письмо на имя Александра Лукашенко, однако Владимир Кудинов отказывался это сделать, после чего подвергался давлению.

Геннадий БАРБАРИЧ

Проблема занятости заключенных

Согласно распоряжению премьер-министра Владимира Ермошина создана рабочая группа для разработки проекта Государственной программы трудовой занятости лиц, отбывающих наказание в учреждениях уголовно-исполнительной системы Республики Беларусь.

Возглавил ее начальник Комитета по исполнению наказаний при Министерстве внутренних дел Сергей Кадушкин. В состав рабочей группы входят также представители министерств экономики, финансов, промышленности, труда, лесного хозяйства, предпринимательства и инвестиций, Главного штаба Вооруженных Сил и концернов "Беллесбумпром" и "Беллегпром". Проект программы должен быть внесен на рассмотрение правительства до 30 декабря 2000 года.

Проблема занятости лиц, отбывающих наказание за совершение преступлений весьма актуальна для Беларуси. В настоящее время в стране различные виды уголовного наказания отбывают более 103 тысяч человек, в том числе в исправительно-трудовых колониях — более 61 тысячи. Около половины из них не заняты, а затраты на одного осужденного ежемесячно составляют 17,8 тысячи рублей.

Олег СОКОЛОВ

Наблюдателей из Европы на выборах не будет?

Делегация Парламентской Ассамблеи Совета Европы (ПАСЕ) по возвращении в Страсбург будет рекомендовать бюро ПАСЕ не посылать наблюдателей на парламентские выборы в Беларусь.

"Мы очень разочарованы видимой нехваткой прогресса в отношении создания адекватных условий, необходимых для проведения свободных и честных выборов в Беларуси", — пояснил глава делегации Терри Дэвис. Он подчеркнул, что это мнение не только его, но и двух других участников делегации — Вольфганга Берендта и Цирила Свободы.

Глава делегации объяснил процедуру дальнейшего принятия решения по Беларуси. 30 августа в Вене пройдет так называемая "техническая конференция", на которой будут представлены парламентские ассамблеи Совета Европы и ОБСЕ, а также Европарламент и другие международные организации. Именно они примут консолидированное решение по поводу того, присылать ли наблюдателей на выборы в Беларусь.

Убийство в Минске

Утром 5 августа в Минске был убит лидер белорусского филиала ультранационалистической организации Русское национальное единство Глеб Самойлов.

Тело Самойлова с ножевыми ранениями было обнаружено в подъезде дома, где он проживал. По факту убийства возбуждено уголовное дело по статье 101 Уголовного кодекса Республики Беларусь "Умышленное убийство".

БелаПАН

Ключевую роль сыграют сами белорусы

"Кто, на Ваш взгляд, может сыграть ключевую роль в разрешении конфликта политических сил в Беларуси?" — с таким вопросом обратились к жителям республики сотрудники лаборатории "НОВАК" в ходе общенационального социологического опроса, проводившегося в мае-июне этого года.

Были опрошены более 1100 человек. 53 % из них считают, что ключевую роль в разрешении конфликта могут сыграть "сами белорусы". 12 % ответивших надеются на Россию, 5 % вообще не видят конфликта политических сил в Беларуси. Еще по 5 % считают, что в роли миротворцев может выступить Запад или Организация по безопасности и сотрудничеству в Европе (ОБСЕ). Остальные 19 % респондентов затруднились ответить на вопрос.

"Дажынкі" пройдут в Шклове

Праздник завершения уборки урожая "Дажынкі" пройдет в этом году 22—23 сентября на родине Александра Лукашенко — в райцентре Шклов Могилевской области.

Шклов готовился к проведению этого праздника еще в прошлом году. На приведение райцентра в порядок, строительство и реконструкцию зданий были выделены немалые государственные средства. Однако в прошлом году "Дажынкі" были отменены; среди причин называлась трагедия на Немиге и невысокие показатели урожая.

В рамках нынешних "Дажынак" будет организовано чествование лучших сельских работников, а также пройдут выступления профессиональных и самодеятельных артистов, художественный вернисаж, выставка изделий народных ремесел и большая сельскохозяйственная ярмарка.

БелаПАН

Звание "полковник" будет присваивать Лукашенко

Согласно новому Положению о прохождении военной службы офицерским составом Вооруженных Сил Республики Беларусь, отныне воинское звание "полковник" будет присваивать не министр обороны, а президент страны.

По словам заместителя начальника управления кадров Министерства обороны Александр Цепота, подобное нововведение "значительно поднимает статус этого высокого воинского звания". Среди других новшеств Цепота выделил норму, согласно которой лишение воинских званий офицеров, состоящих на военной службе и в запасе, будет осуществляться только по приговору суда при осуждении их за совершенное преступление. В этом случае лица, лишенные офицерских званий, увольняются в запас как рядовые, проходившие службу по контракту, с соответствующими изменениями в пенсионном обеспечении. В Положении также закреплено, что лица офицерского состава, в отношении которых ведется следствие или уголовное дело рассматривается судом, не подлежат увольнению с военной службы до принятия решения по делу.

Согласно указу Александра Лукашенко об утверждении Положения о прохождении военной службы офицерским составом Вооруженных Сил, его действие распространяется также на офицерский состав внутренних, пограничных и железнодорожных войск, других воинских формирований, в которых законодательством предусмотрена военная служба.

Олег СОКОЛОВ

Гончарик предлагает извиниться

Председатель Федерации профсоюзов Белорусской (ФПБ) Владимир Гончарик обратился с открытым письмом к главе белорусского государства Александру Лукашенко.

Письмо стало ответом на резкие высказывания в адрес профсоюзов и лично Гончарика, которые прозвучали из уст Лукашенко 27 июля на республиканском селекторном совещании по проблемам АПК.

"С недоумением и огорчением прослушал я Ваше выступление на республиканском селекторном совещании, — пишет Владимир Гончарик. — С огорчением не за себя. Всегда считал, что неуважение к другим, грубость — не лучшие личностные качества. Такой поступок не делает чести любому человеку, тем более Главе государства... У Вас есть возможность доказать, что Вы можете исправить допущенную ошибку — извинитесь".

Владимир Гончарик также отмечает, что ФПБ выступает против вмешательства государственных органов в законную уставную деятельность профсоюзов, поскольку это является нарушением не только Конституции и законов Республики Беларусь, но и президентских указов по вопросам социального партнерства.

БелаПАН

Где быть национальному университету?

В кругах белорусской интеллигенции продолжается обсуждение идеи создания Белорусского национального университета (БНУ) — вуза, преподавание в котором велось бы исключительно на белорусском языке.

Недавно этот вопрос обсуждался на встрече председателя ТБМ Олега Трусова с ректором Белорусского государственного педагогического университета Леонидом Тихоновым. Академик Тихонов выразил заинтересованность идеей создания национального университета, предложив в качестве месторасположения нового вуза старинный город Заславль под Минском. По словам Тихонова, размещение элитных учебных заведений вблизи крупных городов является европейской традицией.

Говоря об использовании белорусского языка непосредственно в Белорусском педагогическом университете, его ректор сообщил, что вуз практически полностью перешел на белорусско-язычное преподавание. В университете, по словам Тихонова, разработана система поддержки преподавателей, переходящих на белорусский язык преподавания. Вселяет надежду и довольно высокий конкурс среди абитуриентов на специальности, связанные с белорусским языком, культурой и историей, который в этом году составил 3–4 человека на одно место.

Наталья КУЛАГИНА

Грядет съезд Советов

Александр Лукашенко подписал указ о созыве 29 сентября в Минске Съезда депутатов Советов депутатов Республики Беларусь.

Согласно указу, в работе Съезда Советов примут участие: депутаты Палаты представителей и члены Совета Республики Национального собрания; делегаты областных и Минского городского Советов депутатов при норме представительства один делегат от двух депутатов; делегаты городских Советов депутатов — один делегат от шести депутатов; делегаты районных, поселковых, сельских, городских Советов депутатов — один делегат от 22 депутатов; представители республиканских органов госуправления, судебных органов, руководители местных исполнительных и распорядительных органов; представители политических партий, профсоюзов и др.

Как отмечается в указе, на обсуждение съезда выносится вопрос "о роли Советов депутатов и общественности в решении экономических и социальных задач, дальнейшей демократизации общества".

Наталья КУЛАГИНА

У ЗЭЛЬВЕ АДЗНАЧЫЛІ 90-ыя ЎГОДКІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

У нядзелю, 6 жніўня, у Зэльву з усіх куткоў Беларусі з'ехаліся людзі, каб адзначыць 90-годдзе з дня нараджэння вялікай беларускай паэткі Ларысы Геніюш.

Урачыстасць пачалася ў Зэльвенскай Троіцкай царкве. Тут адбылося набажэнства ў гонар паэткі, а таксама была адкрыта мемарыяльная шыльда. Упершыню ў гісторыі Беларусі праваслаўная царква ўшанавала такім чынам памяць пра беларускую паэтку. У свой час падобнае зрабіў каталіцкі касцёл, калі ўшанаваў памяць беларуска-польскага паэта Уладзіслава Сыракомлі.

На мемарыяльнай шыльдзе, якую адкрылі ў Зэльвенскай царкве, выбіты словы:

На зямлі беларускай мае алтары.

Ларыса Геніюш (1910-1983).

Паэтка і хрысціянка.

Ад удзячных нашчадкаў у 90-ыя ўгодкі.

З Троіцкай царквы землякі і госці пайшлі на мясцовыя могілкі, дзе знаходзіцца магіла Ларысы Геніюш. На магілу былі ўскладзены кветкі, а зэльвенцы і пісьменнікі памянулі яе добрым словам.

